# 5 кастрычніка Мінсувязі выпускае ў абарачэнне дзве паштовыя маркі з серыі «Сумесны выпуск Беларусі і Пакістана»




5 кастрычніка 2016 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне дзве паштовыя маркі з серыі «Сумесны выпуск Беларусі і Пакістана».

Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Пакістан.

Дызайн маркі № 1156 А.Мядзведзь (фота С.Плыткевіча), маркі № 1157 – А.Салахуддзіна.

Нацыянальны парк «Нарачанскі» размешчаны на паўночным захадзе Беларусі і з’яўляецца часткай Беларускага Паазер’я. Створаны ў 1999 годзе для захавання ландшафтаў, біялагічнага багацця і генетычнага фонду раслiннага і жывёльнага свету.

Нацыянальны парк «Сайфул-Мулук» размешчаны ў правінцыі Хайбер-Пахтунхва Пакістана. Заснаваны ў 2003 годзе для захавання дзікай прыроды ў натуральным стане. Уключае ў сябе горныя хрыбты і возера Сайфул-Мулук – адно з самых высакагорных у краіне, зімой яго паверхню цалкам скоўвае лёд.

У дзень выпуску паштовых марак у абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (магазін «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) і ў Ісламабадзе (Пакістан) будуць праводзіцца спецыяльныя гашэнні на канверце «Першы дзень».

РУП "Белпошта"

**Source URL:**
*https://www.mpt.gov.by/5-kastrychnika-minsuvyazi-vypuskae-u-abarachenne-dzve-pashtovyya-marki-z-seryi-sumesny-vypusk*